<table>
<tr><td>МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ<br>РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ<br>БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ<br>ЎНІВЕРСІТЭТ<br>РАШЭННЕ<br>20.06.2016 № 10<br>г. Мінск</td><td>МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ<br>РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ<br>БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ<br>УНИВЕРСИТЕТ<br>РЕШЕНИЕ<br>2016 г. №<br>г. Минск</td></tr>
</table>

Савета БДУ
“Аб асноўных задачах і накірунках
удасканалення ідэалагічнай і
навучальна-выхаваўчай работы ў БДУ”

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад прарэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Суворава У.В. “Аб асноўных задачах і накірунках удасканалення ідэалагічнай і навучальна-выхаваўчай работы ў БДУ”, судаклады старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Локцевай В.В., старшыні ГА “Саюз жанчын БДУ” Казаковай І.В., Савет адзначае, што ідэалагічная і выхаваўчая работа ў БДУ арганізавана на адпаведным узроўні.

Значнай падзеяй у ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце ў БДУ ў 2015-2016 навучальным годзе стала выбарчая кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ва ўніверсітэце быў распрацаваны і паспяхова рэалізаваны План мерапрыемстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сярод мерапрыемстваў дадзенага плана варта адзначыць:

1. Сустрэчы студэнтаў і работнікаў універсітэта з прадстаўнікамі кіраўніцтва краіны, горада, міністэрстваў, прадпрыемстваў і арганізацый:

- Выступленне з дакладам на тэму “Сучасныя выбарчыя тэхналогіі: механізмы ўцягнення моладзі ў палітычную дзейнасць” кандыдата тэхнічных навук, дацэнта кафедры філасофскіх навук і ідэалагічнай работы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Ільіна Міхаіла Васільевіча (10.09.2015 г.).;
- Адкрытыя дэбаты “Выбірай.BY!” (11.09.2015 г.). У якасці экспертаў адкрытых дэбатаў выступілі Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Жураўкоў, рэктар БДУ Сяргей Абламейка, рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля Баранава,

першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА “БРСМ” Андрэй Белякоў і іншыя;

- Сустрэча са старшынёй Дзяржаўнага памежнага камітэта Рэспублікі Беларусь, генерал-палкоўнікам Мальцавым Л.С. (30.09.2015 г.).

- Сустрэча з намеснікам старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Карпенка І.У. (06.10.2015 г.).

2. З 21 верасня па 5 кастрычніка 2015 года ГА “Саюз жанчын БДУ” арганізаваў серыю мерапрыемстваў: “Мая Радзіма – Беларусь. БДУ ў кантэксце дасягненняў”. Ключавым мерапрыемствам дадзенай серыі стала выстава “Мая Радзіма – Беларусь”, арганізаваная сумесна з пярвічнай арганізацыяй РГА “Белая Русь” БДУ, Музеем сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Нацыянальным агенцтвам па турызме. На выставе былі прадстаўленыя звыш 100 экспанатаў, што расказваюць пра значныя вынікі айчыннай адукацыйнай, навукова-тэхнічнай і прамысловай дзейнасці.

3. З 25 па 27 верасня 2015 года на выяздным адукацыйным семінары для старастаў навучальных групаў 1 курса ў САК БДУ “Брыгантына” (200 стараст 1 курса) арганізавана навучальная секцыя “Моладзь і дзяржава: вектар супрацоўніцтва”.

4. У рамках курсаў павышэння кваліфікацыі куратараў навучальных групаў па праграме “Выхаваўчая работа куратара БДУ: псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты” вядучымі спецыялістамі юрыдычнага факультэта БДУ праведзены практычны занятак “Сучасныя выбарчыя тэхналогіі: моладзь і дзяржава”.

5. На факультэтах філасофіі і сацыяльных навук, філалагічным, гістарычным, сацыякультурных камунікацый юрыдычным факультэтам былі праведзеныя Дні права.

Важнейшым вынікам прадуманай і скаардынаванай працы структурных падраздзяленняў і органаў студэнцкага самакіравання БДУ стаў актыўны удзел студэнтаў у выбарчай кампаніі, іх адказная грамадзянская пазіцыя.

У суадносінах з планам работы Савета на ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце ЮДУ на 2016 год на пасяджэннях рады заслуханыя справаздачы пра стан ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў 2015-2016 навучальным годзе на хімічным, філалагічным, гістарычным факультэтах, факультэце міжнародных адносінаў. Аб эфектыўнасці работы на вышэйпералічаных факультэтах могуць сведчыць такія мерапрыемствы як асветніцка-

патрыятычная акцыя “Вязынка”, “Кошыкбол”, “Лінгвістычны рынг”, “Вішнёвы тэатр”, “Фестываль моваў”, праект “Культурныя людзі”, “Філфактар”, Фестывалі “Пявучыя мовы свету”, “Смачныя мовы свету”, навуковыя семінары, конкурс відэа “Студэнты розных эпохаў і краін” (філалагічны факультэт); індывідуальнае ментарства ў адносінах да студэнтаў 1-2 курса – лаўрэатаў Спецфонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міжнародны турнір СТЕНД (студэнцкі турнір прыродазнаўчых дысцыплін), Дні гісторыі навукі, студэнцкая газета “Chemical boom”, конкурс творчых параў, акцыя “Хімікі супраць наркотыкаў” (хімічны факультэт); навукова-практычны семінар “Роля гістарычных ведаў у працэсе выхавання грамадзянскасці і патрыятызму ў патрыятычным выхаванні моладзі”, Дні беларускай гісторыі на факультэтах, Міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых работ па гісторыі “Агульны шлях да Вялікай Перамогі: да 70-годдзя сканчэння Вялікай Айчыннай вайны”, навуковы клуб экскурсаводаў “IN VIA”, навуковы гурток “РАДАВОД”, Музей гістарычнага факультэта, дэбат-клуб, турыстычны злёт у Анусіна, “ХВІЛІНА СЛАВЫ” (гістарычны факультэт); Рада зямляцтваў, валанцёрскі клуб “Сацыяльная ініцыятыва”, газета “ФМО ОНЛАЙН”, дыскусійны клуб па развіцці навыкаў прававых дэбатаў, Оператрад ФМА “ОСА”, “Большие гонки”, акцыя “Вместе против наркотиков!” (факультэт міжнародных адносінаў).

У рамках пастаянна дзейнічаючага семінара для кіруючых работнікаў і студэнцкага актыву БДУ з дакладамі па выніках НІР у вобласці ідэалагічнай і выхаваўчай работы выступілі:

- Доктар гістарычных навук Слука А.Г. «Метадалагічныя асновы фарміравання ідэалогіі беларускай дзяржавы ў перыяд пераадолення наступстваў сусветнага фінансавага крызісу і рэалізацыі інавацыйнага курса сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь” (21 красавіка 2016 г.);
- Кандыдат гістарычных навук Ходзін С.М. “Праблема захавання нацыянальнага адзінства ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў ХХ ст.” (19 мая 2016 г.);
- Доктар сацыялагічных навук Ротман Д.Г. “Асаблівасці фарміравання і развіцця базавых каштоўнасцяў і светапоглядавых установак розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва ў перыяд станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь” (16 чэрвеня 2016 г.).

З ліку вядучых спецыялістаў і прафесарска-выкладчыцкага складу гуманітарных факультэтаў БДУ сфарміравана інфармацыйна-прапагандысцкая група ў колькасці 11 чалавек для правядзення Адзіных дзён інфармавання ў працоўных калектывах г. Мінска ў рамках дзейнасці РГГА “Знание”.

Планы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ і структурных падраздзяленняў на 2015-2016 навучальны год выкананы.

У рамках святкавання 71-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт упершыню прыняў удзел ў Міжнароднай акцыі “15 дзён да Вялікай Перамогі”. Асноўнай мэтай акцыі з’яўлялася выхаванне нораваў моладзі, узмацненне патрыятычнага духу і згуртаванасці шляхам развіцця ў моладзевым асяродку традыцыі нясення ганаровай варты як механізму праявы асаблівай падзякі ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Студэнты БДУ неслі ганаровую варту каля помніку экіпажа Гастэла (г.п. Радашковічы) і ва ўнутраным дворыку БДУ каля стэлы супрацоўнікам і студэнтам БДУ, што прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Напярэдадні студэнты правялі суботнік на тэрыторыі дадзеных мемарыяльных месцаў.

6 мая 2016 г. ва ўнутраным дворыку БДУ прайшлі святочныя мерапрыемствы ў гонар Дня Перамогі – “Перамога ў сэрцы кожнага”. На працягу навучальнага году рэалізоўваўся праект “Сувязь пакаленняў”, у рамках якога студэнты БДУ наведвалі ветэранаў, віншавалі іх са святамі, дапамагалі ім ў розных побытавых сітуацыях.

Стартам праекта ГА “Саюз жанчын БДУ” “Жанчыны свету супраць вайны і агрэсіі” стала правядзенне 17 лістапада 2015 года круглага стала “Я абіраю Беларусь!” (сумесна з філалагічным факультэтам, гістарычным факультэтам, ФМА і Інфармацыйным цэнтрам японскай культуры ў Мінску) з удзелам беларускіх і замежных студэнтаў і выкладчыкаў, якія абралі нашу краіну месцам вучобы, працы і жыцця.

У БДУ у 2015-1016 навучальным годзе на 1-3 курсах працавалі 544 куратары навучальных групаў. У цэлым, вынікі сацыялагічнага апытання студэнтаў 2, 4 курсаў паказваюць, што студэнты станоўча ацэньваюць работу куратараў навучальных групаў.

Заслугоўвае ўвагі вопыт правядзення на філалагічным факультэце конкурса “Лепшы куратар філалагічнага факультэта”.

Разам з тым, у сучасных умовах узрастае роля куратараў у арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай працы са студэнцкай моладдзю. Для далейшага развіцця і ўдасканалення дадзенага накірунку працы неабходны распрацоўка эфектыўнай сістэмы маральнага і матэрыяльнага заахвочвання

куратараў навучальных групаў з боку кіраўніцтва кафедраў, факультэтаў, у тым ліку выкарыстоўваючы магчымасць зняцця часткова вучэбнай нагрузкі да 50 гадзін для куратараў навучальных групаў па рашэнні Рады факультэта.

На працягу навучальнага году ажыццяўлялася псіхолага-педагагічная падтрымка сацыяльна неабароненых катэгорый навучэнцаў, непасрэдная псіхалагічная дапамога ў складаных для студэнтаў сітуацыях, ва ўмовах асабовых і ўзроставых крызісаў. Праводзіліся гутаркі з бацькамі студэнтаў розных факультэтаў на тэмы ўзаемаадносін і ўзаемаразумення ў сям'і. Кіраўніцтву факультэтаў і інтэрнатаў аказвалася інфармацыйная дапамога ў вобласці ўзаемадзеяння са студэнтамі, праводзіліся гутаркі на тэму паводзінаў студэнтаў у навучальных групах і інтэрнатах. Ажыццяўлялася распрацоўка метадычных рэкамендацый для студэнтаў і супрацоўнікаў.

Значная работа праводзілася па сацыяльна-псіхалагічнай падтрымцы студэнтаў першага курса і адаптацыі замежных студэнтаў.

У рамках праграмы сямейнага выхавання студэнтаў можна адзначыць заняткі па сямейных і дзіцяча-бацькоўскіх адносінах, фарміраванню ролі мамы і таты, пола-ролевых адносінаў, адказным бацькоўстве.

Новым у рабоце псіхалагічнай службы БДУ стаў цыкл заняткаў для выпускнікоў, магістрантаў і аспірантаў па праблемах працаўладкавання і кар'ернага росту, аказана псіхолага-педагагічная падтрымка камандам студэнтаў, удзельнікам міжнародных канферэнцый, конкурсаў і алімпіяд.

У студэнцкім гарадку ў 2015-2016 навучальным годзе было арганізавана больш за 110 культурна-масавых мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел больш 22 500 студэнтаў, і больш ста спартовых мерапрыемстваў з колькасцю ўдзельнікаў больш за тысячу. Упершыню ў 2015 годзе адбылася канцэртна-забаўляльная праграма, прымеркаваная да Дня горада Мінска: “Мы прыехалі павіншаваць”, арганізаваная студэнцкім гарадком БДУ сумесна з адміністрацыяй Маскоўскага раёну г. Мінска. Таксама сумесна з адміністрацыяй Маскоўскага раёну была праведзеная праект-гульня “Схватка. Заражэнне” на тэрыторыі жылога комплексу Студэнцкая вёска. Да Дня народзінаў БДУ быў праведзены спартовы турнір “BSU Battle Game", адрознай рысай якога стала гістарычная скіраванасць. Таксама, ваенна-палявое свята “Франтавыя лісты” змяніла фармат, стаўшы спартова-канцэртным мерапрыемствам патрыятычнай скіраванасці.

У 2015 годзе па выніках Рэспубліканскага фестывалю творчасці замежных студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі “Fest – art.by” творчы калектыў Студэнцкага гарадку БДУ ўзнагароджаны спецыяльным дыпломам за прасоўванне інавацыйных падыходаў у арганізацыю і

правядзенне міжвузаўскіх мерапрыемстваў рэспубліканскага фестывалю. На конкурс быў прадстаўлены праект Студэнцкага гарадку “Міжвузаўскі фестываль нацыянальных культур”.

У 2015-2016 навучальным годзе была арганізавана работа новай спартовай школы пілатэсу на базе інтэрнату №2 БДУ (вул. Кастрычніцкая, 2), распачала сваю работу творчая майстэрня-студыя па мастацкім валянні з воўны і інтуітыўным маляванні “Клуб-ОК” на базе інтэрнату №6 (вул. Кастрычніцкая, 10) і танцавальная студыя “Шанец” у інтэрнаце №4 (вул. Чурленіса, 7). Усяго ў Студэнцкім гарадку функцыянуюць 4 творчых гурткі-студыі і 12 спартовых секцый, якія наведваюць 400 студэнтаў.

На высокім ўзроўні арганізавана сацыяльна-педагагічная дзейнасць і метадычная работа. 17 сакавіка 2016 года на базе інтэрнатаў БДУ №3 і №10 адбыўся семінар “Арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы з моладдзю, якая пражывае ў інтэрнаце. З вопыту работы БДУ”, арганізаваны Студэнцкім гарадком БДУ сумесна з адміністрацыяй Маскоўскага раёну г. Мінска. Семінар быў арганізаваны для намеснікаў кіраўнікоў, што арганізуюць ідэалагічную работу ў працоўных калектывах арганізацый і ўстаноў Маскоўскага раёну г. Мінска. Высокі ўзровень арганізацыі выхаваўчай работы ў інтэрнатах у цэлым і арганізацыі мерапрыемства ў прыватнасці быў адзначаны удзячным лістом адміністрацыі раёну.

У 2015-2016 навучальным годзе ўпраўленнем па справах культуры БДУ працягнутая работа па павышэнні якасці арганізацыі і правядзення разнастайных мерапрыемстваў у вобласці эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі, пашырэнні і ўмацаванні творчых кантактаў. Па стане на 01.06.2016 г. у БДУ функцыянавала 122 зарэгістраваных клубных фарміравання з агульнай колькасцю удзельнікаў 1573 чалавекі. З іх: 2 калектывы са званнем “Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь”, 6 калектываў – са званнем “Народны”.

Сярод найбольш значных культурна-масавых мерапрыемстваў, праведзеных упраўленнем па справах культуры БДУ у 2015-2016 навучальным годзе, варта адзначыць: шоу-праграма для першакурснікаў БДУ “Віват, студэнт!” у Палацы спорту (01.09.2015); цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Дня народзінаў БДУ “БДУ – 94”; спецыяльны праект (цыкл канцэртаў духоўнай музыкі) Народнай харавой капэлы БДУ “Музычная восень” (14-15.11.2015); святочнае тэматычнае мерапрыемства “З Днём народзінаў, Савет зямляцтваў БДУ!” у рамках Рэспубліканскага фестывалю творчасці замежных студэнтаў “F.-ART.by” (19.11.2015); Адкрыты моладзевы музычны фестываль “Такія

пернікі” (лістапад 2015); Міжнародны фестываль студэнцкіх і моладзевых тэатраў “Тэатральны куфар БДУ – 2015” (30.11.2015 – 05.12.2015); дабрачынная канцэртная праграма “Дух Калядаў у БДУ” (16.12.2015); Фестываль Адкрытай Лігі КВЗ (20.02.2015); свята “Ноуруз Байрам у БДУ” (24.03.2015); Фестываль эстрады БДУ (люты-красавік 2016); Фестываль факультэтаў у Ліцэі БДУ (26.03.2016); “Вялікі красавіцкі канцэрт” у рамках Рэспубліканскага фестывалю творчасці “АРТ-Вакацыі – 2016” (20.04.2016); дабрачынны канцэрт дзіцячага ансамблю танцу “Літарынка” БДУ для дзяцей, што знаходзяцца на лекаванні ў Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў (27.04.2016); XI Міжнародны форум студэнцкіх хораў “Папараць-кветка БДУ 2016” (05-08.05.2016); канцэрты творчых калектываў БДУ у гала-канцэрце Рэспубліканскага фестывалю творчасці “АРТ-Вакацыі 2016” у Палацы спорту (14.05.2016); 1-шы Форум творчай моладзі БДУ (17-19.05.2016); святочны канцэрт Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танцу “Крыжачок” БДУ ў вялікім канцэртным зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі (21.05.2016); гульні Адкрытай інтэлектуальнай лігі БДУ (кастрычнік 2015 – травень 2016); гульні Адкрытай Лігі КВЗ БДУ (на працягу года) і інш.

Па выніках Рэспубліканскага фестывалю творчасці “АРТ-Вакацыі 2016” Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт узнагароджаны Гран-пры.

26-27 сакавіка 2016 года каманда “Хто хутчэй” Клуба інтэлектуальных гульняў БДУ прыняла ўдзел ў Адкрытым чэмпіянаце ВНУ Расіі па інтэлектуальных гульнях в г. Санкт-Пецярбургу і стала яго пераможцам у агульным камандным заліку.

Саліст Вакальнай студыі БДУ Улад Макарэвіч (эканамічны факультэт) – стаў Лаўрэатам II ступені XX фестывалю патрыятычнай песні Маскоўскага раёну г. Мінска, а таксама Лаўрэатам III ступені Мінскага гарадскога конкурсу патрыятычнай песні.

18 траўня2016 году ў рамках I Форуму творчай моладзі БДУ пад эгідай упраўлення па справах культуры быў створаны Творчы саюз студэнтаў БДУ (установачная канферэнцыя прайшла на базе Рэспубліканскага цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту “Раўбічы”).

У рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Года культуры ў Рэспубліцы Беларусь у Беларускім дзяржаўным універсітэце ў перыяд з кастрычніка 2015 па снежань 2016 года дзейнічае праект па вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Яго ініцыятарамі выступілі Саюз жанчын БДУ і РГА “Белая Русь”. Праект накіраваны на папулярызацыю матэрыяльнай і духоўнай спадчыны нашай краіны. Праект атрымаў падтрымку ДУ “Нацыянальнае агенцтва па турызме”.

27 красавіка 2016 года ў БДУ ўпершыню прайшло агульнаўніверсітэцкае духоўна-асветніцкае мерапрыемства для студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ “Напярэдадні Вялікадня”, арганізаванае ГА “Саюз жанчын БДУ” сумесна з рэктаратам, упраўленнем па справах культуры, Фундаментальнай бібліятэкай, пярвічнай арганізацыі РГА “Белая Русь” БДУ.

У 2015-2016 навучальным годзе Фундаментальнай бібліятэкай у рамках ідэалагічнай і выхаваўчай працы было арганізавана і праведзена для карыстальнікаў 63 гуманітарна-асветніцкіх мерапрыемстваў (вечарыны, прэзентацыі, сустрэчы, конкурсы, віктарыны, акцыі), якія наведалі 3203 чалавекі.

У справаздачны перыяд пры Фундаментальнай бібліятэцы функцыянавалі два клубных аб’яднанні: Клуб аматараў мастацкага слова “КЛУмБа” (за 2015-2016 навучальны год адбылося 9 пасяджэнняў Клуба, на якіх пабывалі 183 чалавекі) і дыскусійны Кінаклуб “Фруза” (11 пасяджэнняў клуба, 293 удзельнікі).

У перыяд з 21.12.2015 г. па 20.03.2016 г. Фундаментальная бібліятэка сумесна з ГА “Саюз жанчын БДУ”, Мінскім гарадскім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі і культурна-асветніцкім грамадскім аб’яднаннем “Наша Русь” правялі IV Конкурс літаратурнай творчасці “Славянскі калейдаскоп”, прысвечаны Дню адзінства народаў Беларусі і Расіі, 95-годдзю заснавання БДУ і Году культуры. У конкурсе прынялі ўдзел студэнты 16 факультэтаў БДУ, якія прадставілі на конкурс звыш 260 работ у 9 намінацыях. Гран-пры атрымала студэнтка 4 курса Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла Стройлава Кацярына, што даслала свае работы ў намінацыі “Душа сумуе па нябёсах” і “Любоў, Любоў! О! Колькі выратавана памерлых душаў цеплынёй промняў тваіх…”.

22 красавіка 2016 года Фундаментальная бібліятэка БДУ ўпершыню, у ліку 4 сталічных бібліятэк, прыняла ўдзел у Міжнароднай акцыі Бібліяноч-2016, накіраванай на падтрымку чытання і сацыяльнай значнасці літаратуры як важнейшай часткі нацыянальнай культуры.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце ў 2015-2016 навучальным годзе функцыянавалі 3 моладзевыя грамадскія арганізацыі, 14 структур студэнцкага самакіравання і 4 грамадскія камісіі, у рабоце якіх прымаюць удзел кіраўнікі і прадстаўнікі студэнцкіх арганізацый і органаў самакіравання. Сярод найбольш значных мерапрыемстваў і праектаў моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання БДУ варта адзначыць: прафарыентацыйная акцыя “Універсітэт – твой крок у будучыню” для старшакласнікаў г. Смаргонь і Смаргонскага раёна, квест-

гонка “Flashrace”, “Студэнцкі турзлёт БДУ – 2016” (пярвічная арганізацыя з правамі раённага камітэта ГА “БРСМ” БДУ); Першы Фестываль актыўнага ладу жыцця “BSU FEST 2015”, спартова-забаўляльная акцыя “Вакацыі ў Лагойску”, святкаванне Масленіцы ва ўнутраным дворыку БДУ (пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ); выязны адукацыйны семінар для старастаў навучальных груп першага курсу “Ты – староста!”; конкурс фота і відэаработ “БДУ ў тваім фармаце”, Капуснік БДУ, “Фотавеламарафон”, Вясновы баль (ГА “Студэнцкі саюз БДУ”) і інш.

Сярод дасягненняў пярвічнай арганізацыі ГА “БРСМ” БДУ варта адзначыць: Моладзевы атрад аховы правапарадку БРСМ БДУ ўзнагароджаны Граматай за 1-е месца ў рамках Мінскіх гарадскіх спаборніцтваў па стральбе з пнеўматычнай зброі для членаў Моладзевых атрадаў аховы правапарадку г. Мінска ў рамках рэспубліканскай акцыі “Да Абароны Айчыны гатовы”. Падзякі начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Маскоўскага раёну г. Мінска А.М. Шулякоўскага атрымалі камандзір Моладзевага атраду аховы правапарадку БРСМ БДУ і камандзір МААП БРСМ УА “Юрыдычны каледж БДУ” за актыўную грамадскую пазіцыю, удзел у дзейнасці праваахоўных органаў па ахове грамадскага парадку і прафілактыку правапарушэнняў сярод непаўналетніх і моладзі, папулярызацыю службы ў органах унутраных спраў.

Праект Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта “Люстэрка 3D” (аўтар Мікіта Забалоцкі) стаў лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу “100 ідэй для Беларусі”. Праект увайшоў у лік 10 лепшых аўтарскіх распрацовак па ацэнцы Рэспубліканскага экспертнага савету конкурса праектаў “100 ідэй для Беларусі”. Работа Мікіты Забалоцкага стала лепшай у намінацыі “Інфармацыйна-камукацыйныя тэхналогіі і авіякасмічныя тэхналогіі”. Праект “Люстэрка 3D” таксама стаў пераможцам у беларускім этапе стартап-тура фонду “Сколкава”.

Важнай крыніцай фінансавання моладзевых ініцыятыў і праектаў у БДУ стаў конкурс “Лепшы моладзевы праект”. У 2015-2016 навучальным годзе ўдзел у конкурсе прынялі 40 праектных камандаў, 18 з іх выйгралі грант, атрымаўшы фінансавую падтрымку ўніверсітэта ў агульным аб’ёме 50 млн. рублёў. Аднымі са значных праектаў гэтага году сталі: “Мая школа”, “БрамаМар”, “Сувязь пакаленняў”, “СТЭНД”, “Навука на пальцах”, “BSU Cubing Day’s”.

Так, 23 і 24 красавіка 2016 году ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ўпершыню адбыўся Міжнародны чэмпіяат па спідкубінгу (хуткаснай зборцы кубіку Рубіка) «BSU Cubing Day’s». У чэмпіянаце прынялі ўдзел больш за 70 чалавек, у тым ліку спарстмены з Расіі і Украіны, а таксама

навучэнцы старэйшых класаў школ горада Мінска. Арбітрамі чэмпіянату сталі прафесійныя спідкуберы з Беларусі, Расіі і Украіны. Спаборніцтвы праходзілі ў 18 дысцыплінах. За час чэмпіянату былі пастаўлены два нацыянальных рэкорды Беларусі. Студэнт 1 курса факультэту радыёфізікі і кампутарных тэхналогій Павел Юшкевіч устанавіў рэкорд на зборцы кубіка Рубіка адной рукой на хуткасць (11 секунд 41 мілісекунда).

З мэтай вучэбна-метадычнага і псіхолага-педагагічнага забеспячэння дзейнасці студэнцкіх арганізацый, фарміравання перспектыўнага кадравага рэзерву ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю з 25 лютага па 24 траўня 2016 г. ва ўніверсітэце было арганізавана навучанне ў Школе лідара БДУ “Студэнцкі лідар – жыццё на віду!” 25 студэнтаў-актывістаў 1-2 курсаў. Для удзельнікаў школы з лекцыямі і майстар-класамі “Сакрэты лідара, з якім работа пераўтвараецца ў задавальненне”, “Псіхалогія лідара”, “Як знайсці спонсараў для праекту”, “Спікінг, работа з голасам” выступілі выкладчыкі і работнікі БДУ, падзяліліся сваім вопытам паспяховыя выпускнікі БДУ, аб развіцці сваіх ініцыятыў і лідарскіх якасцяў расказалі бізнес-трэнеры і прафесіяналы з розных сфераў. Па выніках навучання удзельнікам школы былі ўручаныя сэртыфікаты.

У адпаведнасці з праграмай БДУ “Працоўнае лета” на 2012-2015 гг. Студэнцкім цэнтрам занятасці “БРСМ” БДУ, УВРМ, Студэнцкім гарадком летам 2015 года былі сфармінаваны 38 студэнцкіх атрадаў (6 сельскагаспадарчых, 5 педагагічных, 14 сервісных, 13 валанцёрскіх), у якіх працавалі 525 чалавек. У індывідуальным парадку працаўладкаваны 601 чалавек. Студэнты ўніверсітэта працавалі на аб’ектах грамадскага будаўніцтва г. Мінска, у педагагічных атрадах у дзіцячым лагеры “Зубраня” ААА “МАЗ”, на сельскагаспадарчым прадпрыемстве РУП “Шчамысліца БДУ”, у грамадскай прыёмнай камісіі БДУ і інш. Усяго улетку 2015 года працаўладкаваны 1126 студэнтаў БДУ.

Апытанні студэнтаў падкрэсліваюць, з аднаго боку, актуальнасць арганізацыі другаснай занятасці БДУ, з іншага – складанасць яе арганізацыі ва ўніверсітэце ў сучасных умовах. Для далейшага развіцця і ўдасканалення работы ў дадзеным накірунку мэтаабумоўлена зацвердзіць праграму БДУ “Працоўнае лета” на 2016-2019 гг.

У БДУ функцыянуе моцны інфармацыйна-камунікацыйны комплекс, важным элементам паспяховай работы якога з’яўляецца стварэнне ўмоў для двухбаковых камунікацыі з асноўнымі мэтавымі аўдыторыямі: студэнтамі, супрацоўнікамі, абітурыентамі. Важную ролю ў забеспячэнні гэтага працэсу граюць афіцыйныя суполкі ўніверсітэта ў сацыяльных сетках. Інфармацыя аб дзейнасці структурных падраздзяленняў і моладзевых

грамадскіх арганізацый апаратыўна размяшчаецца ў электронных і друкаваных СМІ БДУ, факультэтаў, групах універсітэта ў сацыяльных сетках:

- http://www.bsu.by,
- http://www.gazeta.bsu.by
- http://vk.com/bsu_by (больш за 22 000 удзельнікаў)
- http://www.facebook.com/OfficialBSU (каля 1 800 удзельнікаў)
- http://twitter.com/BSU_official (каля 2 500 падпісчыкаў)
- http://www.linkedin.com/edu/school?id=10749 (больш 20 000 выпускнікоў)
- http://instagram.com/instabsuby/ (каля 1000 падпісчыкаў)
- http://www.youtube.com/user/videoBSU (каля 200 000 праглядаў)
- http://plus.google.com/ (каля 88 000 праглядаў).

Сайт БДУ – лепшы сайт сярод навучальных устаноў краіны, пераможца інтэрнэт-прэміі ТИБО-2016 у намінацыі “Адукацыя і навука”. Наведвальнасць сайту – каля 130 000 чалавек у месяц. Маніторынг адваротнай сувязі рэалізаваны з дапамогай рубрыкі “Пытанне-адказ” у службе “Адно акно” на сайце БДУ, а таксама шляхам анлайн-кансультавання ў суполках БДУ ў сацыяльных сетках.

*Разам з тым, на некаторых факультэтах маецца істотны рэзерв у забеспячэнні арганізацыйна-тэхнічнага і педагагічнага суправаджэння дзейнасці афіцыйных суполак факультэтаў і студэнцкага самакіравання ў сацыяльных сетках.*

Для вучэбна-метадычнага і арганізацыйна-тэхнічнага забеспячэння дзейнасці рэдакцыйных калегій студэнцкіх СМІ, афіцыйных суполак факультэтаў і моладзевых арганізацый у сацыяльных сетках Беларускім дзяржаўным універсітэтам пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь з 4 па 6 сакавіка 2016 г. у САК БДУ “Брыгантына” прайшоў VII Міжнародны семінар-практыкум “Зімовая школа студэнцкай журналістыкі”. У рабоце семінара прынялі ўдзел 250 чалавек з ліку рэдакцыйных калегій універсітэцкіх выданняў і рэдактараў сайтаў, афіцыйных суполак у сацыяльных сетках з 25 устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і 6 ВНУ з Азербайджана, Арменіі, Германіі, Расіі і Славакіі.

У ходзе правядзення дадзенага мерапрыемства адбыліся:

- Адукацыйныя семінары пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Інстытута журналістыкі БДУ па накірунках: “Студэнцкая газета ў сістэме

карпаратыўных выданняў”, “Эфектыўныя тэхналогіі стварэння актуальнага медыякантэнту”, “Студэнцкая газета: пошук новай формы і зместу”, “Студэнцкія СМІ ў Інтэрнэце”, “PRасвятленне”, “DailyWe: Сацыяльныя сеткі як новая рэальнасць журналістыкі”;

- Брыфінг з удзелам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь М.А. Жураўкова, першага намесніка Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь І.В. Луцкага;
- Выстава студэнцкіх газет устаноў вышэйшай адукацыі;
- Трэнінгі на камандастварэнні, тэматычнае “Што? Дзе? Калі?”, ролевая гульня “Журналісцкае даследаванне”;
- Майстар-класы прадстаўнікоў вядомых беларускіх СМІ.

В 2015-2016 навучальным годзе 23 студэнты БДУ здзейснілі правапарушэнні. У рамках прафілактыкі правапарушэнняў і прававога выхавання студэнтаў за справаздачны перыяд Студэнцкім гарадком БДУ былі арганізаваны сустрэчы навучэнцаў, пражываючых у інтэрнатах з начальнікам інспекцыі па справах непаўналетніх РУУС Ленінскага раёну г. Мінска, намеснікам главы адміністрацыі Маскоўскага раёну г. Мінска, начальнікам РАНС, начальнікам АГІМ Маскоўскага раёну г. Мінска, старэйшым інспектарам інспекцыі па справах непаўналетніх Кастрычніцкага раёну г. Мінска і інш.

У рамках прафілактыкі ужывання наркатычных і псіхатропных рэчываў, аховы жыцця і здароўя навучэнцаў рэгулярна праводзіліся інфармацыйныя гадзіны, арганізоўваліся круглыя сталы, у інтэрнатах БДУ праводзіліся конкурсы плакатаў па тэмах, звязаных з прафілактыкай шкодных звычак і папулярызацыяй здаровага ладу жыцця. Так, 9 верасня 2015 г. на факультэце сацыякультурных камунікацый адбылася сустрэча з аператыўнымі супрацоўнікамі Цэнтральнага РУУС г. Мінска. Галоўнай тэмай стала прафілактыка ўжывання, захавання і незаконнага ужывання наркотыкаў і наркаўтрымліваючых сродкаў. 23 лістапада 2015 года прайшла лекцыя прадстаўніка дзяржаўнага камітэта судовых экспертызаў Рэспублікі Беларусь Лісіцынай Ю.С. на тэму “Медыка-псіхалагічныя і сацыяльныя наступствы ужывання курыцельных сумесяў (спайсаў)”. 13 красавіка 2016 г. па ініцыятыве факультэта міжнародных адносінаў і мытні “Мінск-2” прайшла акцыя “Разам супраць наркотыкаў!”

На працягу навучальнага году ў 111 групах спартовага ўдасканалення займаліся каля 1500 студэнтаў, у фінальных спаборніцтвах круглагадовай спартакіяды БДУ па 20 відах спорту прынялі ўдзел звыш 3500 студэнтаў, больш за 100 разоў зборныя каманды БДУ накіроўваліся на ўдзел у

рэспубліканскіх спаборніцтвах і спаборніцтвах Рэспубліканскай універсіяды за кошт сродкаў універсітэта.

У 2015-2016 навучальным годзе студэнтам БДУ прысуджана: 1 годнасць Заслужанага майстра спорту, 2 – майстра спорту міжнароднага класа, 5 – майстроў спорту Рэспублікі Беларусь, 12 – кандыдатаў у майстры спорту.

У 2015-2016 навучальным годзе на чэмпіянатах свету і Еўропы, Сусветнай універсіядзе студэнтамі заваяваныя 25 медалёў, з іх 13 залатых, 7 срэбраных, 5 бронзавых. Валейбольны клуб БДУ-БАТЭ заняў 2-е месца ў вышэйшай лізе Чэмпіянату Рэспублікі Беларусь. На міжнародных спаборніцтвах студэнты БДУ выступалі наступным чынам: Сусветная ўніверсіяда – залаты, срэбраны, бронзавы медалі (Я. Цуркін); на чэмпіянаце свету па гіраваму спорту – Карповіч С. – залаты медаль сярод дарослых і сярод студэнтаў; Навакоўскі А. – срэбны медаль сярод студэнтаў; чэмпіянат Еўропы па гіраваму спорту (двухбор'е) – Давыдзік Д. – срэбны медаль, Шаўчэнка В. – срэбны медаль; Еўрапейскія гульні – залаты медаль – Амелюсік Я.У. (веласпорт), бронзавыя медалі заваявалі У. Сасуноўскі і І. Чугашвілі (грэка-рымская барацьба); чэмпіянат Еўропы па шашках – залаты і срэбны медаль (А. Барышава); чэмпіянат свету па плаванні сярод інвалідаў – 6 залатых медалёў (50м, 100м вольны стыль, 100м на спіне, 100м батэрфляй, 400м вольны стыль, 200м комплекс) і срэбны медаль на дыстанцыі 100 м брас заваяваў І. Бокій; чэмпіянат Еўропы па веласпорце на трэку – бронзавы медаль у камандней гонцы (А. Пятроўская). Студэнтка юрыдычнага факультэта Алена Амелюсік заваявала залаты медаль у групавой гонцы чэмпіянату свету па веласпорце, што праходзіў у г. Рычманд (ЗША) у перыяд з 21 па 27 верасня 2015 года, а У. Сасуноўскі заваяваў срэбны медаль на чэмпіянаце свету па грэка-рымскай барацьбе.

Па стане на 01.06.2016 г. на ўліку ў аддзеле сацыяльнай работы УВРМ знаходзіліся 115 студэнтаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, у тым ліку на дзяржаўным забеспячэнні ў БДУ знаходзілася 110 студэнтаў.

ГА "Саюз жанчын БДУ" правёў шэраг акцый па патрантажы студэнтаў, пазбаўленых бацькоўскай апекі пад агульнай назвай "Мы дорым Вам цеплыню нашых сэрцаў!"

У 2015-2016 навучальным годзе матэрыяльную дапамогу з агульнаўніверсітэцкага фонду атрымалі 570 чалавек на суму 703 390 000 рублёў, з сродкаў перавагі даходаў над расходамі – 105 чалавек на суму 120 850 000 рублёў.

У справаздачным годзе на базе студэнцкага санаторыя-прафілакторыя БДУ прайшлі аздараўленне і санаторна-курортнае лекаванне 1 385 студэнтаў, на санаторна-курортнае лекаванне вылучаная 61пуцёўка для работнікаў БДУ.

У БДУ у 2015-2016 навучальным годзе функцыянавала 64 групы “Здароўе”, у якіх займаліся звыш 1000 чалавек штомесячна, фінансаванне груп ажыццяўлялася за кошт сродкаў прафсаюзнай арганізацыі работнікаў універсітэта і прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

У сувязі з вышэйадзначаным Савет БДУ ВЫРАШЫЎ:

1. Адобрыць справаздачу прарэктара У.У. Суворава аб выкананні Плану ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ на 2015-2016 навучальны год.
2. Зацвердзіць План работы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ на 2016-2017 навучальны год. Першаму прарэктару (Івашкевіч А.А.), прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.У.) забяспечыць выкананне гэтага плану ў поўным аб’ёме.
3. Прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.У.), начальніку ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (Багамазаў А.П.) да 01.07.2016 г. распрацаваць План мерапрыемстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу VI склікання Рэспублікі Беларусь. Першаму прарэктару (Івашкевіч А.А.), прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.У.) забяспечыць выкананне гэтага плану ў поўным аб’ёме.
4. Дэканам факультэтаў, кіраўнікам устаноў адукацыі БДУ:

   4.1 правесці інфармацыйна-тлумачальную работу са студэнтамі аб значнасці будучай выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь для сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і грамадскага жыцця краіны;

   4.2 узмацніць кантроль за выкананнем студэнтамі вучэбнай дысцыпліны, мэтаваму выкарыстанню навучальных аўдыторый;

   4.3 узмацніць індывідуальную работу прафесарска-выкладчыцкага складу, накіраваную на фарміраванне адказнай грамадскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры навучэнцаў для недапушчэння ўцягнення студэнтаў у дзейнасць незарэгістраваных грамадскіх арганізацый і

удзелу студэнтаў у несанкцыянаваных грамадска-палітычных мерапрыемствах;

4.4 забяспечыць арганізацыйна-тэхнічнае і педагагічнае суправаджэнне дзейнасці афіцыйных суполак факультэтаў і органаў студэнцкага самакіравання факультэтаў у сацыяльных сетках;

4.5 забяспечыць арганізацыйна-тэхнічнае і педагагічнае суправаджэнне дзейнасці студэнцкіх аб'яднанняў і фарміраванняў, клубаў і гурткоў па інтарэсах на факультэтах;

4.6 распрацаваць эфектыўную сістэму маральнага і матэрыяльнага заахвочвання куратараў навучальных груп.

5. Падтрымаць ініцыятыву ГА "Саюз жанчын БДУ" па рэалізацыі агульнаўніверсітэцкага праекту "Жанчына году БДУ".

6. Зацвердзіць праграму БДУ "Працоўнае лета на 2016-2019 гг.".

7. Упраўленню выхаваўчай работы з моладдзю (Багамазаў А.П.), дэкану факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Інстытута журналістыкі БДУ (Басава А.І) з прыцягненнем адпаведных структурных падраздзяленняў правесці курсы павышэння кваліфікацыі для куратараў навучальных груп на праграму "Выхаваўчая работа куратара БДУ: псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты" з 13 па 21 верасня 2016 г.

8. Упраўленню выхаваўчай работы з моладдзю (Багамазаў А.П.) сумесна з кіраўнікамі факультэтаў, устаноў адукацыі комплекса БДУ, пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэту ГА "БРСМ" БДУ правесці з 29.08 па 09.09.2016 года сустрэчы са студэнтамі першага курса факультэтаў пра мэты, задачы, накірункі і формы работы камітэта ГА "БРСМ" БДУ і факультэтаў.

9. Упраўленню па справах культуры (Макарэвіч В.М.) аказаць садзеянне Творчаму саюзу БДУ у правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё моладзевай ініцыятывы, творчых праектаў, студэнцкага самакіравання.

10. Студэнцкаму гарадку (Мелех А.В.) пашырыць практыку правядзення семінараў рэспубліканскага, гарадскога і раённага ўзроўняў па рэалізацыі асноўных накірункаў выхавання студэнцкай моладзі ва ўмовах інтэрнатаў.

Старшыня Савета БДУ С.У. Абламейка

Вучоны сакратар Савета БДУ С.М. Ходзін